ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ**

**ЗАГАД**

09.10.2024 № 690

г.Гомель

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ**

**ПРИКАЗ**

г.Гомель

Аб правядзенні абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу дэкаратыўна-прыкладной творчасці "Саматканы цуд"

З мэтай патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання навучэнцаў праз іх далучэнне да каштоўнасцей беларускай культурнай спадчыны, прыцягнення ўвагі дзяцей і творчай моладзі праз сродкі візуальнага мастацтва да народных мастацкіх рамёстваў, традыцыйнага і сучаснага мастацкага тэкстылю, развіцця дзіцячай творчасці ў галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва

ЗАГАДВАЮ:

1. Правесці ў кастрычніку 2024 года – студзені 2025 года абласны этап рэспубліканскай выставы-конкурсу дэкаратыўна-прыкладной творчасці "Саматканы цуд" (далей - Конкурс).

2. Зацвердзіць палажэнне аб правядзенні Конкурсу, склад аргкамітэта Конкурсу (дадаткі 1, 2).

3. Ускласці адказнасць за:

3.1. якаснае правядзенне адборачных этапаў, суправаджэнне работ на абласны этап Конкурсу на кіраўнікоў аддзелаў (упраўлення) адукацыі райгарвыканкамаў, аддзелаў адукацыі, спорту і турызму адміністрацый раёнаў г.Гомеля;

3.2. арганізацыю і правядзенне Конкурсу на ўстанову адукацыі (далей – УА) "Гомельскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі" (Екіменка С.В.).

4. Кіраўнікам аддзелаў (упраўлення) адукацыі райгарвыканкамаў, аддзелаў адукацыі, спорту і турызму адміністрацый раёнаў г.Гомеля забяспечыць:

4.1. удзел навучэнцаў у Конкурсе згодна з палажэннем;

4.2. падрыхтоўку і правядзенне адборачных этапаў Конкурсу не пазней за 20 снежня 2024 года;

4.3. дастаўку работ на абласны этап Конкурсу ва УА "Гомельскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі" да 23 снежня 2025 года.

Зак. 017000-018500

5. Кантроль за выкананнем загада ўскласці на намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення адукацыі Кавалёву А.Г.

Начальнік галоўнага ўпраўлення Р.І.Смірноў

Намеснік начальніка
галоўнага ўпраўлення
А.Г.Кавалёва

Начальнік аддзела
А.І.Клачкова

Дробаў
Макушкін 8 (0222) 21 20 07

Дадатак 1
да загада начальніка
галоўнага ўпраўлення
адукацыі
09.10.2024 № 690

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні абласнога этапу рэспубліканскай выставы-конкурсу дэкаратыўна-прыкладной творчасці "Саматканы цуд"

**1. Мэты і задачы**

патрыятычнае і духоўна-маральнае выхаванне навучэнцаў праз іх далучэнне да каштоўнасцей беларускай культурнай спадчыны;

прыцягненне ўвагі дзяцей і творчай моладзі праз сродкі візуальнага мастацтва да народных мастацкіх рамёстваў, традыцыйнага і сучаснага мастацкага тэкстылю;

развіццё дзіцячай творчасці ў галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

выяўленне і падтрымка юных талентаў;

матывацыя педагогаў дадатковай адукацыі да ўдасканалення свайго прафесійнага майстэрства і інавацыйнага пошуку ў галіне дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

**2. Арганізатары**

Галоўнае ўпраўленне адукацыі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта;

установа адукацыі "Гомельскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі".

**3. Удзельнікі**

Навучэнцы ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Узрост удзельнікаў ад 6 да 18 год.

**4. Умовы правядзення**

Конкурс праводзіцца з кастрычніка 2024 года па студзень 2025 года ў тры этапы з вызначэннем пераможцаў і прызёраў другога і трэцяга этапаў:

першы этап (адборачны) – праводзіцца ва ўстановах адукацыі;

другі этап (адборачны) – раённы, гарадскі (г. Гомель);

трэці этап (адборачны) – абласны.

На кожным этапе Конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт па яго правядзенню (далей – аргкамітэт).

Да ўдзелу ў Конкурсе ў абласны аргкамітэт да 23 снежня 2024 года

раённым (Гомельскаму гарадскому) аргкамітэтам неабходна прадставіць у абласны арганізацыйны камітэт па адрасе: 246050 г.Гомель, вул. Пралетарская, 2, УА "Гомельскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі", аддзел выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці:

заяўку на ўдзел у Конкурсе (дадатак 1);

маніторынг удзелу ў Конкурсе (дадатак 3);

выпіску з пратакола раённых (гарадскога) аргкамітэтаў па выніках раённых (г.Гомель) этапаў Конкурсу;

інфармацыйныя матэрыялы Конкурсу на беларускай мове (каталожныя дадзеныя, заяўка) па электроннай пошце otdel-dpt@uoggodtdim.by з паметкай "Саматканы цуд";

лепшыя работы (не больш, чым 3 работы ў кожнай намінацыі кожнай узроставай катэгорыі).

Даведкі па тэлефоне 8 (0232) 34 90 55.

**5. Патрабаванні да работ**

На Конкурс прымаюцца індывідуальныя і калектыўныя работы, розныя па тэматыцы, кампазіцыі і тэхніцы выканання, традыцыйнага і сучаснага напрамку: ткацтва, вышыўка, народныя лялькі, лялькі ў нацыянальным строі, беларускі традыцыйны рэгіянальны касцюм, яго элементы і інтэрпрэтацыі, лямец, тэкстыльная аўтарская лялька, тэкстыльны арт-аб'ект (аб'ёмныя абстрактныя работы).

На адваротным баку кожнай работы абавязкова размяшчаюцца каталожныя дадзеныя, дзе ўказваецца назва работы, прозвішча, імя і ўзрост аўтара, назва аб'яднання па інтарэсах, прозвішча, імя, імя па бацьку педагога, поўная назва ўстановы адукацыі (гл. дадатак 1).

Работы павінны быць творчымі і арыгінальнымі ў тэматычным плане, у эксперыментаванні з матэрыялам, мець яркае і выразнае раскрыццё вобразаў, выкананы акуратна, згодна з тэхналогіямі, у адпаведнасці з кампазіцыйнымі асаблівасцямі.

**6. Намінацыі Конкурсу:**

– "Вышыўка";
– "Ткацтва";
– "Габелен";
– "Лямец";
– "Вязанне";
– "Традыцыйная лялька";
– "Сучасная лялька";
– "Нацыянальны касцюм";
– "Тэкстыльны калаж";
– "Арт-аб'ект".

Пераможцы і прызёры Конкурса вызначаюцца ў трох узроставых катэгорыях: 6-9 гадоў, 10-13 гадоў, 14-18 гадоў.

Работы ацэньваюцца ў адпаведнасці з крытэрыямі згодна з дадаткам 2 да дадзеных умоў.

Журы пакідае за сабой права на вызначэнне колькасці прызавых месцаў у намінацыях (колькасць прызавых месцаў можа быць павялічана або зменшана).

Арганізатары не нясуць адказнасці за памылкі друку, дапушчаныя раённымі (гарадскім) аргкамітэтамі ў суправаджальнай інфармацыі.

Работы напрамую ад устаноў адукацыі і раённых камітэтаў г.Гомеля, а таксама звыш квоты і пасля названай даты не прымаюцца. Гомельскі гарадскі аргкамітэт праводзіць адбор з удзельнікаў устаноў адукацыі адміністрацыйных раёнаў і ўстаноў адукацыі гарадскога падпарадкавання.

Работы, якія не адпавядаюць тэматыцы, неакуратна выкананыя, няправільна аформленыя, без бірак, да ўдзелу ў Конкурсе не дапускаюцца.

**7. Падвядзенне вынікаў Конкурсу**

Журы разглядае работы, прадстаўленыя на Конкурс, у адпаведнасці з намінацыямі і ўзроставымі катэгорыямі ўдзельнікаў.

Пераможцы і прызёры Конкурсу ў кожнай намінацыі і ўзроставай катэгорыі ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II, III ступені галоўнага ўпраўлення адукацыі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта.

Найлепшыя работы ўвойдуць у экспазіцыю Гомельскай вобласці і будуць прадстаўлены на рэспубліканскім этапе Конкурсу, які адбудзецца ва ўстанове адукацыі "Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі".

Інфармацыя аб правядзенні і выніках Конкурсу будзе размешчана на сайце УА "Гомельскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі" gomelpalace.by у раздзеле "Конкурсы і праекты".

Дадатак 1
да палажэння
аб правядзенні Конкурсу

Заяўка на ўдзел у абласным этапе рэспубліканскага конкурсу
дэкаратыўна-прыкладной творчасці "Саматканы цуд"

| № п/п | Назва работы | Прозвішча, імя аўтара, узрост | Назва аб'яднання па інтарэсах | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога | Назва ўстановы |
|---|---|---|---|---|---|
| Намінацыя "Вышыўка" | | | | | |
| 1 | "Конь" | Іваноў Іван, 15 гадоў | аб'яднанне па інтарэсах "Спадчына" | Паўлавец Вольга Мікалаеўна | ДУА "Добрушскі раённы цэнтр дадатковай адукацыі" |
| | | | | | |

Прыклад афармлення каталожных дадзеных

"Конь"
**Іваноў Іван, 15 гадоў**
аб'яднанне па інтарэсах
" Спадчына"
педагог Паўлавец Вольга Мікалаеўна
ДУА "Добрушскі раённы цэнтр
дадатковай адукацыі"

Дадатак 2
да Палажэння аб
правядзенні Конкурсу

Крытэрыі ацэнкі конкурсных работ абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Саматканы цуд”

| № п/п | Крытэрыі | Балы |
|---|---|---|
| 1. | Захаванне беларускіх народных рамёстваў | ад 0 да 10 |
| 2 | Кампазіцыйнае і каляровае рашэнне | ад 0 да 10 |
| 3 | Адзінства стылявога, мастацкага і вобразнага рашэння работы | ад 0 да 10 |
| 4 | Арыгінальнасць ідэі, самабытнасць мастацкага ўвасаблення | ад 0 да 10 |
| 5 | Спалучэнне традыцыйнай творчасці і сучаснай культуры | ад 0 да 10 |
| 6 | Выкарыстанне новых тэхнік і тэхналогій у творчых работах | ад 0 да 10 |
| | **Максімальная колькасць балаў** | **60** |

Дадатак 3
да Палажэння
аб правядзенні Конкурсу

Маніторынг удзелу ў абласным этапе рэспубліканскага конкурсу дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Саматканы цуд”
_______________раён

| ЭТАПЫ | Колькасць прадстаўленых работ усяго / з іх УДАДіМ | Колькасць аб’яднанняў па інтарэсах усяго / з іх УДАДіМ | Колькасць удзельнікаў усяго / з іх УДАДіМ | Колькасць установ усяго / з іх УДАДіМ |
|---|---|---|---|---|
| Раённы (гарадскі) этап | | | | |
| Абласны этап | | | | |

Дадатак 2
да загада начальніка
галоўнага ўпраўлення
09.10.2024 № 690

Склад аргкамітэта
абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу
дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Саматканы цуд”

| | |
|---|---|
| Екіменка С.В. | дырэктар УА “Гомельскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі”, старшыня; |
| Барсукова Н.Г. | загадчык аддзела выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці УА “Гомельскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі”; |
| Жарабцова А.Л. | загадчык сектара выставачнай дзейнасці УА “Гомельскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі”; |
| Макушкін А.В. | намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце УА “Гомельскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі”. |